# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069.15:001.895(476)

*Т. А. Джумантаева*

## Музейныя тэхналогіі ў праектах інтэграцыі горада і музея

*Разглядаецца месца музейных тэхналогій, перш за ўсё інтэрактыўных партысіпатыўных праектаў, у працэсе інтэграцыі музея і горада на прыкладзе праекта «Фрэска» Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Адзначаецца, што актыўны ўдзел музейнай аўдыторыі ў музейнай камунікацыі з мэтай набыцця асабістага вопыту засваення музейнай прасторы стварае ўмовы крэатыўнага падыходу да асэнсавання культуры гістарычнага горада. Канстатуецца, што стварэнне інтэрактыўнага асяроддзя для актыўнай і патэнцыяльнай музейнай аўдыторыі з'яўляецца эфектыўным інструментам музейных тэхналогій. Інтэграцыя музея ў прастору гістарычнага горада адбываецца праз музеефікацыю, музеялізацыю і рэпрэзентацыю культурнай спадчыны з дапамогай праектнай дзейнасці музеяў, у якой галоўная роля адводзіцца творчасці прадстаўнікоў мясцовай супольнасці. У метадалагічным плане аўтарам артыкула выкарыстоўваюцца марфалогія музейнасці, распрацаваная В. С. Сапанжой, мадэль музейнай камунікацыі Э. Хупер-Грынхіл, структура тыпаў прасторавага дыскурсу музея і горада, прапанаваная В. С. Сапанжой і Н. М. Драздовай-Пічурынай.*

***Ключавыя словы:*** *гістарычны горад, інтэграцыя, інтэрактыўны праект, музеефікацыя, музейныя тэхналогіі, музеялізацыя, музей-запаведнік.*

*T. Jumantayeva*

## Museum technologies in integration projects of the city and the museum

*The article examines the place of museum technologies, first of all interactive participatory projects, in the process of integration of the museum and the city, using the example of the "Fresca" project of the Art Gallery of the National Polotsk Historical and Cultural Museum-preserve. The active participation of the museum audience in the process of museum communication in order to gain personal experience for the better development of the museum space creates conditions for a creative approach to the development of the cultural space of the historical city. Creating an interactive environment for an active and potential museum audience is a tool of museum technologies. The integration of the museum into the space of the historical city takes place through the processes of museification, musealization and representation of*

*cultural heritage with the help of museum technologies, namely, the project activities of museums, in which the main role is given to the creativity of representatives of the local community. Methodologically, the author of the article uses the morphology of museumness developed by V. Sapanzha, the model of museum communication by E. Hooper-Greenhill, the structure of types of spatial discourse of the museum and the city, proposed by V. Sapanzha and N. Drazdova-Pichuryna.*

***Key words:*** *historical city, integration, interactive project, museification, museum technology, museumization, museum-preserve.*

Грамадства, арыентаванае на вернасць традыцый, свайго мінулага, асуджана на знікненне. Грамадства, арыентаванае на сваё сапраўднае, асуджана на застой. І толькі грамадства, арыентаванае на будучыню, здольна развівацца[1]

А. Тойнбі

Музей выступае як складовая частка гісторыка-культурнай прасторы, якая ўздзейнічае на ступень і характар трансляцыі вопыту пакаленняў і ў той жа час забяспечвае сувязь паміж грамадствам і спадчынай, якая належыць грамадству. Пры гэтым перад музеем стаіць дваякая мэта: захаванне культурнай спадчыны для будучых пакаленняў і яе адкрыццё для сучаснікаў. У сённяшняй сацыякультурнай сітуацыі музей павінен будаваць дзейнасць на аснове аналізу патрэбнасцей мясцовай супольнасці. Апора на інтарэсы мясцовых жыхароў у навукова-фондавай, навукова-даследчай і экспазіцыйнай рабоце, у культурна-адукацыйных і забаўляльных праектах музея, прыцягненне ўвагі да дасягненняў і праблем музейных прафесіяналаў становяцца ўсё больш распаўсюджанымі. Музей імкнецца да арганізацыі актыўнага ўдзелу насельніцтва: як у індывідуальных ініцыятывах, так і праз грамадства сяброў музея, сацыяльныя сеткі, музейныя клубы і іншыя формы. Для гэтага ён павінен быць максімальна адкрытым: мець сваё прадстаўніцтва ў Інтэрнэце, рэгулярна інфармаваць аб мэтах і задачах, бліжэйшых і перспектыўных планах.

*Мэта артыкула* – прааналізаваць мэтазгоднасць ужывання выпрацаваных музейных тэхналогій, якія маглі б прынесці плён для інтэграцыі горада і музея.

Многія партысіпатыўныя праекты[2], якія музей рэалізуе ў гарадской прасторы, значна мяняюць яго адносіны з прадстаўнікамі мясцовай супольнасці. Вынікам такіх практык становіццаператварэнне музея ў даступнае і неабходнае месца зносін, правядзення вольнага часу і сумеснай дзейнасці.

Горад – гэта механізм захавання памяці. Ад таго, якая памяць кандэнсуецца ў горадзе, на што музей акцэнтуе ўвагу гараджан, шмат у чым

[1] Тут і далей цытаты прыведзены ў перакладзе аўтара артыкула.

[2] Сумесныя, заснаваныя на актыўным асабістым удзеле грамадзян.

залежыць іх светаадчуванне. Напрыклад, важна выбраць стратэгію ўдзелу жыхароў у стварэнні ўласнай гісторыі. Зварот да гараджаніна як агента гісторыі, якім з'яўляецца кожны чалавек, можа дапамагчы стаць больш шчаслівым.

На думку прадстаўнікоў сусветнай музейнай супольнасці, існаванне музея ў горадзе з'яўляецца фактарам паляпшэння якасці жыцця яго жыхароў. У сучасных умовах назіраюцца наступныя тэндэнцыі ў музейнай сферы: змены ў дынаміцы і сэнсах функцый, з'яўленне новых тыпаў і відаў музеяў, пашырэнне меж дзейнасці. Традыцыйны музей ператварыўся ў інтэграваны сацыякультурны інстытут, аб'ектамі вывучэння, захавання і рэпрэзентацыі якога сталі не толькі асобныя артэфакты, але і архітэктурныя помнікі, ансамблі гарадоў, прыродныя і культурныя ландшафты, пэўныя віды гаспадарчай дзейнасці і духоўнага жыцця грамадства – адным словам, уся культурная спадчына.

Музей – дзейсны сродак засваення асяроддзя, дзе жыве мясцовая супольнасць, фактар стабілізацыі яе якасцей, інструмент вырашэння многіх сацыяльных праблем. Сёння развіццё музеяў на месцах, у невялікіх соцыумах спрыяе сацыяльнай адаптацыі, кансалідацыі грамадства, зняццю напружання. З дапамогай музейных метадаў або тэхналогій (музеефікацыя, музеялізацыя, крэатыўныя партысіпатыўныя праекты і інш.) адбываецца засваенне гісторыка-культурнай спадчыны і такім чынам інтэграцыя музея ў культурную прастору горада. На шляху актуалізацыі і рэпрэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны важным і надзейным з'яўляецца якасна новы від музея – музей-запаведнік, місіяй якога сталі не толькі захаванне і прэзентацыя аб'ектаў і прасторы гісторыка-культурнай спадчыны, але і канструяванне адносін з мясцовымі жыхарамі, і непасрэдны ўдзел у паляпшэнні якасці жыцця мясцовай супольнасці.

Праектная дзейнасць музея-запаведніка адрозніваецца ад функцыянавання невялікага музея тым, што музейная прастора запаведніка, якая выходзіць за межы музейнага будынка, прыдатная для правядзення праектных мерапрыемстваў. Запаведнік мае больш шырокі выбар тэм, матэрыяльныя і прафесійныя рэсурсы для ажыццяўлення музейных праектаў у гарадской прасторы. Сучасныя гараджане актыўна ўдзельнічаюць у развіцці і фарміраванні музейнага кантэнту, прысвечанага іх гораду, і гэтыя адносіны адбіваюцца на ўспрыманні імі горада: ён становіцца не толькі месцам пражывання, але і месцам вывучэння. Так рэалізуецца адзін з магістральных трэндаў развіцця сучаснага горада, асабліва гістарычнага, у якім любая культурная прастора, дзе працуюць з тэмай памяці, мясцовым кантэкстам, дзе гісторыя аказваецца даступнай для вывучэння і інтэрпрэтацыі, становіцца музеем у пашыраным значэнні гэтага паняцця – «музеем без меж».

Музейная дзейнасць набывае ўсё большае сацыякультурнае значэнне. Музеефікацыя як метад актуалізацыі спадчыны пашыраецца да музеялізацыі ў якасці музейнай вытворчасці і музейнага спажывання. Пасродкам музеялізацыі адбываецца інтэрпрэтацыя музейных каштоўнасцей (музеалій), што спрыяе захаванню культурнай памяці. Па сцвярджэнні В. С. Сапанжы, музеялізацыя стала камунікатыўным працэсам камемарацыі і рэалізацыі музейнасці [3, с. 10]. Сучасная музейная камунікацыя сканцэнтравана на рэгенерацыі гарадской памяці. Музейныя прадметы, якія валодаюць пэўнай інфармацыяй і значэннямі, будучы ўключанымі ў сістэму экспазіцыі, нясуць дадатковую сэнсавую нагрузку. Даследчыца з Лейстэрскай школы музеялогіі Э. Хупер-Грынхіл разглядае нараджэнне сэнсаў як двухнакіраваны працэс, у якім не толькі спецыяліст надае музейнаму прадмету пэўны сэнс, арганізуючы яго ў экспазіцыю, але і кожны наведвальнік прыўносіць сваю інтэрпрэтацыю згодна з асабістым вопытам [5]. Дадзены падыход дазваляе ўсвядоміць, што музей з’яўляецца штучнай камунікатыўнай сістэмай і прымяненне яго да музейнай камунікацыі можа дапамагчы распрацаваць з прадстаўнікамі мясцовай супольнасці (пастаяннымі наведвальнікамі музея) адрасныя праграмы супрацоўніцтва, якія будуць адпавядаць сучасным умовам развіцця грамадства.

У метадалагічным плане ў кантэксце ўзнятых пытанняў звернемся да структуры тыпаў прасторавага дыскурсу музея і горада, прапанаванай В. С. Сапанжой і Н. М. Драздовай-Пічурынай. Як адзначаюць даследчыцы, «першы дыскурс … класічны, пры якім музей і мегаполіс незалежныя адзін ад аднаго. Другі... пры якім музей і мегаполіс супрацьстаяць адзін аднаму. Трэцім тыпам прасторавага дыскурсу з’яўляецца дыскурс уключэння, пры якім музей актыўна выходзіць у прастору горада, але пры гэтым сам горад рэагуе на гэта пазітыўна. Чацвёртым тыпам з’яўляецца прасторавы монадыскурс, пры якім музей становіцца калі не горадаўтваральным, то, па меншай меры, вызначае спецыфіку не проста гарадской прасторы, але яе метафізіку. Пятым варыянтам прасторавага дыскурсу з’яўляецца сітуацыя гарадской музеялізацыі, пры якой сам горад імкнецца стаць музеем» [1]. Прапанаваная структура тычыцца мегаполісаў, але сучасная сітуацыя, калі свет уступіў у «тысячагоддзе гарадоў» і палова насельніцтва планеты гараджане [2], дазваляе нам удзельнічаць у згаданым дыскурсе. Гарадскі вопыт з’яўляецца новым для мільёнаў людзей і адначасова вызначае глыбокія змены ў іх самаідэнтыфікацыі і ўспрыманні навакольнай рэчаіснасці. Менавіта гарадскія музеі паслядоўна дзень за днём займаюцца даследаваннем гэтага працэсу, пашыраючы музейную структуру і шчыльнасць музейнага асяроддзя. Але які б ні быў метадалагічны падыход, асноўнай дзейнасцю музея застаецца прадуцыраванне асяроддзя, стварэнне крэатыўнай прасторы.

Галоўнай асаблівасцю дасягнення музеем поспехаў і эфектыўнасці з'яўляецца багаты выбар музейных тэхналогій, якімі ён валодае. Ідучы шляхам інтэграцыі гістарычнага горада і музея і актыўна выкарыстоўваючы ў працы музейныя тэхналогіі, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік ажыццявіў шэраг доўгатэрміновых інтэрактыўных праектаў. Напрыклад, праект «Фрэска» працуе ў экспазіцыі «Сценапіс XII–XIX стст. Спаскага храма ў Полацку» (мал. 1) Мастацкай галерэі (філіял музея-запаведніка). Экспазіцыя, створаная ў 2013 г. і значна дапоўненая ў 2016 і 2019 гг., распавядае пра ўнікальную Полацкую школу архітэктуры і манументальны жывапіс Спаса-Праабражэнскага сабора XII ст., які захаваўся да нашых дзён. Помнік знаходзіцца ў межах Полацка на тэрыторыі дзеючага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, створанага Святой Еўфрасінняй Полацкай у 1125 г. Сабор быў пабудаваны ў 40-х гг. XII ст. за адзін будаўнічы сезон полацкім дойлідам Іаанам па замове прападобнай Еўфрасінні. Храм распісаны фрэскамі, якія захаваліся і раскрытыя ў поўным аб'ёме. Работы па раскрыцці фрэсак, якія экспануюцца ў галерэі, ажыццяўляліся адначасова з адслаеннем і пераносам на новую пастаянную аснову позняга алейнага жывапісу XVIII–XIX стст.

Экспазіцыя ў Мастацкай галерэі пабудавана на прынцыпах спалучэння тэматычнай экспазіцыі і адкрытага захоўвання адслоенага жывапісу XVIII–XIX стст., што дазволіла на абмежаваных плошчах прадставіць максімальную колькасць фрагментаў сценапісу. Экспазіцыя ўключае археалагічныя знаходкі XII ст., копіі фрэсак XII ст. і іх графічныя прорысы, макеты помнікаў архітэктуры, прадметы літургічнага ўжытку і асабістай набожнасці, а таксама лічбавыя праекцыі і фільмы, якія фіксавалі працэсы адкрыцця фрэсак, адслаення і перанясення на пастаянную аснову алейнага жывапісу. Спецыфіка экспазіцыі як сістэмы заключаецца ў тым, што ўсе яе элементы, у тым ліку інфармацыйнае забеспячэнне, складаюць адзінае цэлае і не парушаюць гарманічнасці і сутнаснай асновы. Дзякуючы музеефікацыі як асноватворнаму прынцыпу захавання спадчыны і магчымасці транслакацыі помніка, экспазіцыя прэзентуе адначасова тры інтэр'еры ўнікальнага Спаскага храма: фрэскавую праграму XII ст. (у копіях, відэафільмах і фотаздымках), алейныя роспісы 1837 г. і 1885 г. (арыгіналы). Гэта дазваляе наведвальнікам музея ацаніць філасофскі падыход, узровень успрымання і развіцця мастацтва ў рэгіёне ў розныя эпохі, што вельмі каштоўна для пабудовы агульнай карціны культурнай прасторы гістарычнага горада.

З 2016 г. экспазіцыя працуе ў інтэрактыўным рэжыме. Спачатку наведвальнікі былі сведкамі работ па таніраванні адслоенага жывапісу, бо працы вяліся ў іх прысутнасці (мал. 2). Сёння новым этапам працы з экспазіцыяй стаў інтэрактыўны праект «Фрэска», у якім могуць пры-

няць удзел усе жадаючыя. У 2020 г. навуковыя супрацоўнікі Мастацкай галерэі размясцілі ў экспазіцыі прорыс фрагмента роспісу алтарнай часткі Спаса-Праабражэнскага храма – кампазіцыі «Эўхарыстыя» (мал. 3). У царкве яе цяжка разглядзець, таму што яна знаходзіцца ў алтары, што ў сваю чаргу выклікае асаблівы інтарэс наведвальнікаў, якія імкнуцца атрымаць поўную інфармацыю пра біблейскую гісторыю сюжэта і тэхніку напісання фрэскі.

У абсталяванай майстэрні мастака-фрэскіста ў наведвальніка ёсць магчымасць сумесна з навуковым супрацоўнікам стварыць рэпліку часткі кампазіцыі (мал. 4). Выбар фрагмента малюнка, замес тынкавага раствору, атрыманне тэмпернага фарбавага пігмента, перанясенне малюнка пры дапамозе калькі на «сцяну», нанясенне граф'і, выкананне непасрэдна каляровага рашэння роспісу спалучаецца з натуральнай прысутнасцю ў часе, атрыманнем тактыльнай інфармацыі і асабістага дачынення да культурнай спадчыны. Наведвальнік, ствараючы фрагмент роспісу, можа пакінуць аўтарскі подпіс на фрэсцы, замацаваць фрагмент на агульнай кампазіцыі і пакінуць у музеі[3] альбо забраць з сабой. Праца можа выконвацца ў некалькіх падыходах, а гэта значыць, што «фрэскіст» вяртаецца некалькі разоў у майстэрню, пакуль «фрэска» не будзе завершана. Ён можа працаваць не адзін, а разам з сябрамі, калегамі, проста новымі знаёмымі, з якімі сустрэўся ў музеі (мал. 5, 6). Для большасці ўдзельнікаў праекта важна дзяліцца інфармацыяй і сумесна абмяркоўваць атрыманыя вынікі. Пакінутыя ў экспазіцыі работы будуць прадстаўлены на выставах, а затым перададзены ў нядзельную школу пры Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры (мал. 7, 8).

Аналізуючы інтэрактыўны праект як інструмент музейнай тэхналогіі, які прызваны музейнымі сродкамі зацікавіць гараджаніна крэатыўна засвойваць культурную спадчыну гістарычнага горада, мы можам сцвярджаць пра дасягненне мэты. Музейная прастора, абраная для праекта, і працуючая ў ёй экспазіцыя разглядаюцца як семіятычная прастора, аснову якой складае ўзаемадзеянне асобных яе кампанентаў, што пастаянна знаходзяцца ў дынаміцы і ўступаюць у дыялог з іншымі сістэмамі. Чалавек з яго ўспрыманнем, уяўленнем, інтэлектуальным і творчым патэнцыялам, апынуўшыся ў такой прасторы, не толькі ўспрымае інфармацыю. Ён робіцца стваральнікам уласнай семіятычнай сістэмы, зразумелай і даступнай толькі яму, грунтуецца на асабістым доведзе, даляглядзе і дачыненні да рэчаіснасці, можа ствараць, дзяліцца, узаемадзейнічаць.

[3] У экспазіцыі размешчана абтынкаваная плоскасць памерам 350х170 см са схемай роспісаў алтара Спаскай царквы.

«Ствараць – азначае, што наведвальнікі прыўносяць свае ўласныя ідэі і творча працуюць ва ўзаемадзеянні з іншымі людзьмі. Дзяліцца – азначае, што людзі абмяркоўваюць, перапрацоўваюць і дзеляцца з іншымі як тым, што яны ўбачылі, так і тым, што яны стварылі падчас наведвання музея. Узаемадзейнічаць – азначае, што людзі маюць зносіны з іншымі людзьмі – супрацоўнікамі музея і наведвальнікамі, якія маюць нейкі свой персанальны інтарэс» [4].

Такім чынам, наведвальнік праз форму музейнай інтэрактыўнай камунікацыі ўключаецца ў культурны кантэкст гістарычнага мінулага свайго горада. Яму становяцца зразумелымі прызначэнне храмавых роспісаў, ідэі праграмы роспісу Спаскага храма, тэхніка жывапісу, майстэрства мастакоў і рэстаўратараў. Адбываецца актуалізацыя і засваенне культурнай спадчыны. Музей рэалізуе сваю пракрэатыўную функцыю, якая накіравана на выяўленне і актывізацыю творчых здольнасцей на аснове культурнага вопыту, прыкладзе ўзораў высокага мастацтва, народных традыцый і тэхнічных дасягненняў папярэдніх пакаленняў.

У кожнага горада і яго гараджан ёсць свае дух, твар, індывідуальнае мінулае і будучыня. Навукова прадуманыя сучасныя музейныя тэхналогіі здольны ўдзельнічаць у стварэнні крэатыўнай гарадской прасторы, дзе творчы падыход дазволіць улавіць дух месца і сфарміраваць такую інтэграцыйную праграму развіцця, што дасць людзям, гарадской супольнасці, якія пражываюць у гэтым месцы, будаваць будучыню з улікам унікальнасці дадзенага месца-часу, гістарычнай пераемнасці і культурнай прывабнасці.

1. *Дроздова-Пичурина, Н. Н.* Диалектика пространственного дискурса музея и мегаполиса: К постановке проблемы [Электронный ресурс] / Н. Н. Дроздова-Пичурина, О. С. Сапанжа // Музей – Памятник – Наследие. – 2017. – № 1. – С. 87–93. – Режим доступа: https://museumstudy.ru/wp-content/uploads/2017/11/Drozdova.pdf. – Дата доступа: 14.10.2022.

2. *Негри, Массимо.* Городские музеи: всегда есть чему поучиться [Электронный ресурс] / Массимо Негри // Третья науч.-практ. конф. «Музей в городе – город в музее», Москва, 7–8 дек. 2018 г. : сб. материалов. – С. 5–10. – Режим доступа: https://mosmuseum.ru/wp/wpcontent/uploads/conference/2018.pdf?ysclid=l4022672jw. – Дата доступа: 04.10.2022.

3. *Сапанжа, О. С.* Классификация музеев и морфология музейности: структура и динамика / О. С. Сапанжа // Вопросы музеологии. – 2012. – № 1 (5). – С. 3–12.

4. *Шуклина, Е. А.* Партисипативный музей: практики проектирования и исследования [Электронный ресурс] / Е. А. Шуклина, С. Ю. Каменский // Вестн. Сургут. гос. пед. ун-та. – 2015. – № 3 (36). – С. 154–165. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/partisipativnyy-muzey-praktiki-proektirovaniya-i-issledovaniya. – Дата доступа: 04.10.2022.

5. *Hooper-Greenhill, E.* Changing Values in the Art Museum: rethinking communication and learning / E. Hooper-Greenhill // International Journal of Heritage Studies. – 2000. – Vol. 6, iss. 1. – P. 9–31.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 01.11.2022.